УДК 947.6
ББК 63.3(2)5(4Бел)
Ж11

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Навуковы рэдактар*
В. М. Фамін, доктар гістарычных навук, прафесар

*Рэцэнзенты:*
У. І. Навіцкі, доктар гістарычных навук, прафесар;
З. В. Шыбека, доктар гістарычных навук, прафесар

**Жытко А. П.**
Ж11 Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг.: Манагр.— Мн.: БДПУ, 2003.— 233 с.
ISBN 985-435-556-X

У манаграфіі ўпершыню ў беларускай гістарычнай навуцы комплексна даследуецца гісторыя дваранства Беларусі ў перыяд станаўлення і развіцця капіталістычных адносін. Аналізуюцца разрады, крыніцы папаўнення вышэйшага саслоўя, дынаміка яго колькаснага, веравызнальнага і нацыянальнага складу, адукацыйны ўзровень. Значнае месца займае разгляд ролі дваранства ў развіцці эканомікі краю. Даследуецца дваранскае землеўладанне, развіццё земляробства, жывёлагадоўчай і прамысловай вытворчасці. Значнае месца ўдзяляецца аналізу палітыкі царызму ў дачыненні да карпаратыўнай арганізацыі вышэйшага саслоўя Беларусі і яго дзяржаўнай службы.

Прызначаецца навукоўцам, настаўнікам, студэнтам, шырокаму колу чытачоў.

УДК 947.6
ББК 63.3(2)5(4Бел)

ISBN 985-435-556-X

© А. П. Жытко, 2003
© ВВЦ БДПУ, 2003

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. П. Жытко**

# ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ. 1861 — 1914 гг.

*Манаграфія*

Мінск 2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Глава 1.
# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ І КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ

## 1.1. Гістарыяграфія праблемы

Гістарыяграфічны аналіз любой праблемы вымагае ад даследчыка шэрагу метадычных патрабаванняў. Каб, па магчымасці, пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак, гісторык павінен прытрымлівацца прынцыпаў гістарызму, аб'ектыўнасці, каштоўнаснага падыходу. Мы ацэньваем заслугі навукоўцаў, зыходзячы з таго, які ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі больш позніх даследчыкі ў параўнанні з сваімі папярэднікамі. Пры гэтым неабходна ўлічваць характар грамадска-палітычнай сітуацыі ў той ці іншы час, узровень развіцця гістарычнай навукі ў цэлым і г. д. У сувязі з гэтым вывучэнне гісторыі Беларусі можна ўмоўна падзяліць на наступныя этапы: дарэвалюцыйны, савецкі (тут навукоўцы выдзяляюць наступныя падэтапы: 1 падэтап — 20-я гг., 2 — 30-я — сярэдзіна 50-х гг., 3 — другая палова 50-х — сярэдзіна 80-х гг., 4 — другая палова 80-х — пачатак 90-х гг.[1]) і постсавецкі перыяды. Зразумела, што ў аснову такой перыядызацыі пакладзены якасныя, сутнасныя прыметы.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі гісторыя вышэйшага саслоўя ў Расійскай імперыі больш-менш поўна была вывучана да 1861 г. Гэта тычыцца такіх капітальных прац, як "Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права" А. Рамановіч-Славацінскага, "История сословий в России" В. Ключэўскага, "История дворянского сословия в России" М. Яблачкава і інш.[2] У першай з указаных прац аб'ектам даследавання стаў юрыдычна-прававы бок гісторыі вышэйшага саслоўя імперыі. Тут знайшлі адлюстраванне і некаторыя аспекты прававога становішча дарэформеннага дваранства Беларусі. А. Рамановіч-Славацінскі падзяліў набілітэт заходніх губерняў на дзве асноўныя часткі — магнатаў і шляхту. Ён падрабязна засяродзіўся на палітыцы "разбору" шляхты, якой даваў станоўчую адзнаку. Лічыў, што рэпрэсіі былі апраўданымі, але запозненымі[3].

Гісторыя дваранства парэформеннага перыяду не падвяргалася глыбокаму навуковаму вывучэнню, хаця дваранскае пытанне ў гэтыя гады

---

[1] Караў Д. Беларуская гістарыяграфія XX ст.— адна з крыніц фарміравання менталітэту нацыі // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 3. С. 103.

[2] Романович-Славатинский А. Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права. Киев, 1912; Ключевский В.О. История сословий в России: Курс, читанный в Московском университете в 1886 году. Изд. 2-е. М., 1914; Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб., 1876.

[3] Романович-Славатинский А. Дворянство в России... С. 96.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ